№ 11 (40) Пятніца, 8-га красавіка 1927 г. м. Вільня Год II.

Беларускае слова

Выходзіць р[...]

Цана нумару 20 грош.

Нацыянальнае адра[...] рыялыція [...]рна-нацыянальная аутаномія.—Зямля сялянам на падставе уласнасьці.—Шырокі дэмократызм.—Барацьба з комунізмам.—[...] —Краевая згода.—Далучэньне Ус[...] Беларусі да Заходняй.

Падпісная цана на 1 месяц 1 зл.
„ „ „ 3 „ 2 зл.
Заграніцу ўдвая даражэй.

А[дрэс Р]эдакцыі і Адміністрацыі: Wilno ul. Ludwisarska 5 m 2.
Рэдакцыя адчынена ад 12—2 гадз. штодня апрача сьвятаў.

Цана абвестак: перад тэкстам—20 гр.
„ сярод тэксту —25 гр.
„ на апош. стар.—10 гр.
за радок нонпарэля.

ПАРА ГЛЯНУЦЬ У ВОЧЫ НЕБЯСЬПЕЦЫ.

Не прайшло яшчэ двух тыдняў як мы зазначылі, што два магутных аружжа кантонскай арміі — яе ўльтранацыяналістычны кірунак і адкрытая ненавісьць да чужаземцаў—разложаць і пагубяць армію Чан-Со-Ліна. І вось падзеі разьвіваюцца шпарчэй, як мы нават аб гэтым думалі. Разьбіўшы першы авангард паўночнай арміі пад Нанкінам і Шанхаем; зьдзекамі, грабежамі, забойствамі чужаземцаў падарваўшы ў карані аўтарытэт усіх іншых „вялікіх" дзяржаваў, палуднёвая армія ідзе на Пэкін. Сумліву быць ня можа, што лёс Чан-Со-Ліна вырашаны — яму ня ўстрымаць ужо стыхійнай хвалі нацыяналістычных палчышчаў. Нам, перажыўшым расейскую рэвалюцыю і эпоху хатніх войнаў зусім зразумелым і ясным прадстаўляецца тое зьявішча, якое разыгрываецца на абшарах Далёкага Усходу. Мы добра памятаем, як былі разьбіты тры магутныя арміі Дэнікіна, Калчака і Юдэніча тым жа аружжам, якім апэруюць сяньня кіраўнікі кантонскай арміі. Кітай яшчэ нядаўна прадстаўляў сабою толькі узбуранае мора. І вось зьвярнуўшы ўвагу на адзін толькі мамэнт—ненавісьць *усіх* кітайцаў да ўсіх чужаземцаў — бальшавікі плянова, упарта і надзвычай лоўка гэтую ненавісьць паглыбілі ў кітайскім народзе і вылілі ў пэўныя формы. І можна сяньня сьцьвердзіць, што „вялікія дзяржавы" гэта прагледзілі і тое, што робіцца сяньня ў Кітае, для многіх дзяржаваў, а перад усім для Англіі, зьяўляецца непапраўным няшчасьцем. Англія і іншыя дзяржавы трацяць на заўсёды ў Кітаі свае землі і вякамі накопленыя багацьці.

Усё гэта зрабіў магутны саюз міжнародных геніяльных жулікаў і праступнікаў усяго сьвету—3-ці Інтэрнацыянал. Зрабіў гэта на Далёкім Усходзе. Зрабіўся прыяцелем і кіраўніком жоўтай расы ў барацьбе яе з эўрапэйцамі. Так, уся Эўропа, а нават дальназорочная Амэрыка і хітрая Японія гэтае прагледзілі. Усіх дыплёматаў, паслоў і палітыкаў, — якія не бачылі, што рабілася пад іх носам, трэба павыганяць вон.

І вось мы баімося, каб часам не здарылася-б і ў нас гэткае няшчасьце — каб ня прышлося і ў нас выганяць нашых дыплёматаў і замежных паслоў!.. Тое, што робіцца ў нас пад носам больш грознае, як тое, што яшчэ зусім нядаўна рабілася ў Кітаі... Атмасфэра і грунт для рожнай комуністычнай работы ў Польшчы, а перад усім на Усходніх Крэсах больш падатныя для розных рэвалюцыяў, *чым* гэта было ў Кітаі. Факт надзвычайнага росту Грамады і N. P. Ch. і падпольных комуністычных арганізацыяў яскрава кажа, аб гэтым і грунце і настрою. Мы не дапускаем нават і думкі, каб урад Пілсудскага гэты настрой яшчэ пагаршаў далей цягнучы з рэформамі. Наадварот—мы бачым, што рэформы гатуюцца і пачынаюць праводзіцца ў жыцьцё, але робіцца гэта паволі дый і спадзевацца, што направа наступіць адразу — ніяк нельга.

За надта глыбокі гаспадарчы крызіс Польшча перажывае, *каб адразу бы наступіла направа*. З другога бока *за надта* доўга зьбіралася ненавісьць і крыўда на несправядлівасьці да беларусаў, каб дапусьціць, што сяньняшні настрой на крэсах раптам бы зьмяніўся на карысьць Польшчы. Гэта можа стацца толькі так сама паволі і паступова.

І вось прымаючы гэтае пад увагу і маючы 3-ці Інтэрнацыянал пад самым бокам, які гэтак жа плянова вядзе ў нас падрыўную работу, як вёў яе ў Кітае—першы моцны ўрад Польшчы павінен зрабіць свае выгады. Польшча як найбліжэйшы сусед бальшавікоў, як першая перашкода для экспансіі Савецкага Саюзу на Захад—Польшча павінна загадзя, ужо цяперака думаць аб тым, што ёй яшчэ гэтак ці інакш з бальшавікамі прыдзецца зыйсьціся ў апошнім рашучым спатканьні. Польшча ня можа сяньня разьлічаць на дапамогу некага, калі б на яе раптам напала б Савецкая Расея. Тады будзе позна. Трэба ўжо цяперака прыгатавацца ня толькі для абароны, а Польшча павінна быць ініцыятарам новага аканчальнага паходу ўсіх культурных дзяржаваў проці дзікага Усходу — бальшавіцкага Усходу. Толькі рашучы вайсковы паход проціў гада, засеўшага ў Маскве і распаўсюджываючага заразу па ўсяму сьвету, будзе ратункам усяго культурнага сьвету, а прадусім Польшчы. Пара глянуць небясьпецы проста ў вочы і неадкладаць нямінуючай барацьбы, слабеючы з кожным днём, а трэба пайсьці на сустрэчу гэтай небясьпецы і *перамагчы*.

8-ыя угодкі дыктатуры фашызму.



На ўрачыстасьці з прычыны 8-х угодкаў фашыстаўскага перавароту ў Італіі—дыктатар Муссаліні гавора прамову.

Палітычны агляд.

Пакуль што ўся Эуропа жыве толькі падзеямі ў Кітае і яшчэ не зьліквідаваным балканскім канфліктам між Юга-Славіяй і Італіяй, які прыняў зацяжную форму. Пад націскам вялікіх дзяржаваў Італія і Юга-Славія згадзіліся на ўладжаньне непаразуменьня шляхам безпасрэдніх перагавораў. Паводле інфармацыяў лёнданскіх карэспандэнтаў амэрыканскай прэсы паворот да новай стадыі належыць прыпісаць спэцыяльнай інтэрвэнцыі Чэмбэрлена перад Муссаліні. Першы быццам у асабістым пісьме патрэбаваў ад дыктатара Італіі прынцыповай згоды на безпасрэдныя перагаворы з Юга-Славіяй, бо Англіі прыкра было слухаць агульнае абвінавачаньне яе ў тым, што яна зьяўляецца пасрэдняй прычынай балканскаго канфлікта, як перад вайною Нямеччына была адказнай за Сараеўскі канфлікт, выклікаўшы сусьветную вайну. Муссаліні даў сваю згоду пад варункам, што Юга-Славія ў сваю чаргу дасьць згоду на ратыфікацыю гаспадарчага дагавору з Італіяй, падпісанага два гады таму назад у Нетуна. І Юга-Славія быццам дала прынцыповую згоду Чэмбэрлену на гэтае жаданьне.

Але гэтымі прынцып вымі згодамі Белграда і Рыма яшчэ ня ўхіляюцца ўсе труднасьці на шляху поўнай ліквідацыі балканскага палітычнага крызісу. Італьянскі пасол у Белградзе прадставіў тры наступныя жаданьні свайго Ураду: 1) зьвязаньне ратыфікацыі дагавору ў Нетуна з пэўнымі зьменамі на карысьць Італіі, 2) прызнаньне Юга-Славіяй італьянска-албанскага гарантыйнага пакту, заключанага ў Ціране і 3) уступкі на карысьць Вэнгрыі, якая хоча вольнага доступу да Адрыятыцкага мора цераз порт Фіумэ.

У адказ на гэта Юга-Славія з свайго боку заявіла, што: 1) калі Італія высунула пытаньне аб зьмене Нэтуанскага дагавору, дык гэта зьмена мусіць наступіць толькі на карысьць Юга-Славіі, 2) пакт, заключаны ў Ціране, ня можа быць прызнаны ў цяперашняй форме, бо ён азначае скасаваньне незалежнасьці Албаніі і 3) што пытаньне аб доступе Вэнгрыі да мора можа быць вырашана толькі шляхам безпасрэдных перагавораў між Юга-Славія, прымаючы пад увагу інтарэсы апошняй, але без усякага ўмешацельства і ўплыва на гэта Італіі. Апрача таго Белград зажадаў, каб Ліга Народаў ці іншы міжнародны чыньнік гвварантаваў поўную назалежнасьць Албаніі.

Гэткім чынам належыць спадзявацца, што гэта пытаньне ня будзе вырашана шляхам безпасрэдных перагавораў між Юга-Славіяй і Італіяй без умяшацельства Лігі Народаў. У гэты час абнаружыўся вельмі цікавы факт, сьведчачы аб паважных пераменах у палітычных адносінах між папярэднімі пераможцамі і пераможанымі ў Еўропе. Белградская газэта „Палітыка" незадаваленая англійскай палітыкай ў адносінах Італіі, пагражае хаўрусам між Бэрлінам, Парыжам і Белградам. Гэта здаецца першае прызнаньне з боку пераможцаў забытае няроўнасьці, паўстаўшай пасьля вайны між Нямеччынай і яе былымі ворагамі. У гэтым канфлікце першы раз Нямеччына выступае ў характары пасрэдніка наранзэ з Францыяй і Англіяй. І зусім магчыма, што гэта пагроза Белграда зроблена не бяз ведама і падсказу Бэрліна і Парыжа, заклапочаных зацясьненьнем англійска італьянскай дружбы і пашырэньнем уплыв у Італіі на Балканах і Блізкім Усходзе. Пры гэтым намечаецца зусім іншае палітычнае дзяленьне Еўропы, чым было дагэтуль. Так напрыклад Вэнгрыя і Баўгарыя, ваяваўшыя разам з Нямеччынай і варожа настроеныя проці пераможцаў, цяпер выразна пераходзяць на бок Італіі разам з Румыніяй, у той час як Юга-Славія і Францыя, а можа Чэха-Славакія больш імкнуцца да Нямеччыны для захаваньня сярэдня Эўрапэйскай палітычнай раўнавагі. К слову будзе адмеціць, што з першага красавіка ў Вэнгрыі спыніла сваю работу ваенная кантрольная камісія хаўрусьнікаў. І з гэтага часу Вэнгрыя, таксама як і Нямеччына могуць спакойна павялічываць свае ўваружэньні, захоўваючы толькі ўстаноўленыя мірнымі трактатамі лічэбныя склады арміяў. Нямеччына ўжо траціць шмат больш на загатоўку ваеннага матэрыялу для 100 000 арміі, чым перад вайною для 800,000 арміі.

Ня менш цікавы зварот наступіў у палітыцы Польшчы ў адносінах да Радавай Расеі. Нядаўна быў у Варшаве польскі пасол у Маскве Патэк, які перад гэтым адведаў Харкаў і Петраград. У часе яго пабыту ў Варшаве абгаварывалася пытаньне аб заключэньні польска-радавага гарантыйнага пакту. У выніку гэтых перагавораў міністар заграінчных справаў Залескі заявіў выразна, што скора пачнуцца афіцыяльныя перагаворы між Масквою і Варшаваю аб заключэньні спачатку гарантыйнага, а пасьля і гандлёвага дагавораў, з якіх першага найбольш дамагаецца Радавая Расея, а другога Польшча. Адсюль відаць, што Польшча зусім адступіла ад першапачатковага свайго пляну заключэньня агульнага пакту разам з балтыцкімі рэспублікамі, на што не згаджаліся бальшавікі. Але як толькі апошнім пашчасьлівілася разьбіць агульны фронт сваіх заходніх суседзяў, заключыўшых асобныя гарантыйныя пакты з Літвою і Латвіяй, дык і для Польшчы не заставалася іншага выхаду як пайсьці на згоду з Масквою, у якой цяпер звальняюцца рукі на Д. Усходзе. І зусім магчыма, што на гэты раз польска-бальшавіцкія перагаворы аб пакце бясьпекі закончацца ўсьпешна У гэты час у Маскву прыехаў пэрсыдскі міністар фінансаў для заключэньня гандлёвага дагавору між Пэрсыяй і Радавай Расеяй. Яму быў зроблены вельмі гасьцінны прыём. Апрача гандлёвых мусіць будуць парушаны і палітычныя справы Гэткім чынам Радавая Расея з часам будзе акружана непрарыўным ланцугом дзяржаваў, заключыўшых з ёю гарантыйныя і хаўрусныя дагаворы. Толькі адна Румынія застаецца ў невыразных палітычных адносінах з Масквою, у той час як Кітай на Усходзе, Афганістан, Пэрсія і Турцыя на паўдні, Польшча, Літва, Латвія і скора Эстонія на Захадзе будуць у выразна прыязных адносінах з ёю. Гэта зьявілася ўсьпешнаю контр-мераю бальшавіцкай дыплёмацыі проці англійскага пляну акружэньня Радавай Расеі ланцугом антыбальшавіцкіх дзяржаваў. Праўда Англіі ў апошні час пашанцавала працягнуць на свой бок і папсаваць яе адносіны з бальшавікамі, але гэта ня мае вельмі вялікага палітычнага значэньня дзеля таго, што Італія ня мае безпасрэдняй стычнасьці з Расеяй. А затым, як мы бачылі раней, гэта нарабіла толькі лішніх клопатаў Заходняй Эўропе дзякуючы таму, што Італія пачала вельмі самаўпраўна гаспадарыць на Балканах. І агульная палітычная сытуацыя ў Зах. Эўропе вельмі невыразная.

Яшчэ больш нявыразная сытуацыя ў Кітае. Кантонская армія ўсьпешна заняла Шанхай і Нанкін і вядзе наступленьне на Пэкін. Паводле заявы камандуючага кантонскай арміяй гэн. Чан-Кай-Шэка Кантон намеціў першай сваей мэтай заняцьце Пэкіна і аб'еднаньне ўсяго Кітая. А тагды толькі будзе размова з чужаземнымі дзяржавамі. З Нанкіна ўсе чужаземцы выгнаны, а маемасьць іх разграблена. Праўда за гэта гэты горад з мільённым насяленьнем быў абстраляны ваенным флотам дзяржаваў. Цяпер як раз ідзе дыплёматычная перапіска з Кантонам адносна адшкадаваньня за прычыненыя страты чужаземным дзяржавам і іх грамадзянам. Англія, Амэрыка і Японія напісалі ноты, жадаючыя грашовых кампэнсацыяў і гарантый, што ўперад не паўторацца падобныя выпадкі. Гэн. Шэк заявіў, што ён разсьледуе гэты факт на месцы і дасьць задавальняючы адказ. Але можна прадбачыць наперад, які гэта будзе адказ,—састаўлены пад дыктоўку бальшавіцкага дарадчыка Барадзіна. Кантон абяцае зьвярнуць чужаземцам страты, але ўзамен патрэбуе заплаты за зьнішчэньні, прычыненыя абстрэлам горада. Гэтак квіталіся бальшавікі з Англіяй і Францыяй, трэбаваўшых адшкадаваньня за ўбыткі, панесяныя іх грамадзянамі ў часе бальшавіцкай рэвалюцыі ў Расеі. У кожным разе, сытуацыя лічыцца вельмі сур'ёзнай. З Англіі, Амэрыкі і Японіі прыбываюць ўсё новыя подкрапленьні Тры названыя дзяржавы папераджаюць, што калі толькі Кантон ня дасьць задавальняючага адказу, дык магчыма будзе блёкада марскіх берагоў Палуднёвага Кітаю.

У Шанхае палажэньне невыразнае. Чужаземцы сабралі там для абароны сваіх канцэсіяў каля 35.000 войска ўваружанага і маючага артылерыю, танкі, бранявікі і якія прыкрываюцца вялізарным ваенным флотам. Аб заняцьці кітайцамі чужаземных канцэсіяў ў Шанхае шляхам аружнага нападу ня можа быць і мовы. Для гэтага ў кантонцаў німа адпаведных тэхнічных сродкаў. Але праўда і чужаземцы ня будуць мець ніякіх матэрыяльных выгад, адрэзаныя ад унутранага Кітая. Гэтакае палажэньне вычакаваньня працягнецца бадай да той пары, пакуль не пераможа тая ці іншая старана ў Кітае. Цяпер ужо можна здаецца без памылкі прадказаць, што перамога будзе на боку Кантона, які адмовіўся ад усякіх перагавораў з Чанг-Тсо-Лінам і пэкінскім урадам і вядзе наступленьне на Пэкін. У Пэкіне чужаземцы ўжо рыхтуюцца да ад'езду. Толькі застаюцца пакуль неяснымі два пытаньні: першае — што будзе, як палуднёвая армія дойдзе да манджурскай, дзе фактычным гаспадаром зьяўляецца Японія, якая не пазволіць вырваць з сваіх рук тое, што захапіла пасьля расейска-японскай вайны, і другое — якія адносіны ўсяго аб'еднанага Кітая будуць да бальшавікоў. Як відаць ужо сымпатыі кантонцаў не растуць, а на адварот — слабеюць нават па меры новых усьпехаў. У зусім магчыма, што аканчальны трыумф нацыянальна-асвабадзіцельнага руху ў Кітае будзе канцом бальшавіцкіх уплываў, як гэта было ў Турцыі.

N.

Заняцьце Шанхаю.



Гэн. Чан-Кай-Шэк, які стаіць на чале кантонскай арміі, заняўшай Шанхай.

Апошнія навіны.

У Польшчы.

ЗЬЕЗД ВАЯВОДАЎ. Цэлы дзень 2 сакавіка ў Варшаве адбываўся зьезд ваяводаў. Прыбыла на зьезд 17 ваяводаў. У пасед жаньнях прымалі ўдзел міністры: Бартэль і Складкоўскі.

Зьезд быў пасьвячаны палепшаньню арганізацыі адміністрацыі і з'арыентаваньню ў настроях грамадзянства.

СПЛ[illegible]Ў ЛЕСУ ПА НЕМНУ. Адна вялікая англійская фірма зьвярнулася да літоўскага ўраду з просьбай дазволіць ёй сплаў лесу па Нёмну, на аснове выпрацаваных у свой час літоўскім урадам правілаў і варункаў. Згода літоўскім урадам будзе дана і ў самай бліжэйшай будучыне пачнецца сплаў вялікай партыі лесу, закупленай гэтай фірмай у Віленшчыне.

НОВЫ ПРЭЗЫДЫУМ УКРАІНСКАГА КЛЮБУ. Украінскі парлямэнтарны клюб зрабіў выбары да свайго прэзыдыуму. Стары прэзыдыум, як ведама, складаўся амаль выключна з сельробаў і нядаўна быў прымушаны выйсьці ў адстаўку.

Да новага прэзыдыуму ўвайшлі: Сяргей Хруцкі (ундо), Казубскі (ундо) і Назарук. Сябры Сельробу ў выбарах удзелу ня прымалі.

ЯШЧЭ АДНА ПАРТЫЯ. Паслы, якія выйшлі некалькі дзён таму назад з клюбу Незалежнай Партыі Хлопскай, а іменна: Бон, Шакун і Шапель падалі да Соймавае канцэлярыі заяву аб утварэньні новага клюбу пад назвай: „Radykalna Partja Włościanska Ziem Białoruskich“.

ПАДАРОЖА МІТРАПАЛІТА. Гэтымі днямі выежджае да Белграду, Сафіі, Афін і Канстантынопалю дэлегацыя праваслаўнае царквы ў Польшчы. На чале дэлегацыі будзе стаяць мітрапаліт Дзяніс, які прылучыцца, да дэлегацыі ў Вене.

РАССТРЭЛ 2 ШПІЕНАЎ. У Тарунскім вайсковым судзе закончылася справа проці паручнікаў Урбаніка і Пёнтка, якія былі абвінавачаны ў шпіёнстве на карысьць суседняе дзяржавы. На судзе ўся справа вялася тайна.

Па нарадзе суд абвесьціў прыгавар, на моцы якога абодва абвінавачаныя прыгавораны на выдаленьне з войска, пазбаўленьне грамадзкіх правоў і кару сьмерці праз расстрэляньне.

Камандзір корпусу гэн. Бэрбэцкі прыгавар зацьвердзіў. Абаронцы абвінавачаных зьвярнуліся да П. Прэзыдэнта з просьбай, каб памілаваў засуджаных. Аднак П. Прэзыдэнт не скарыстаў з права ласкі і засуджаныя былі расстрэляны на адным з фартоў Таруні.

10,000,000 КРЭДЫТУ. З Варшавы надыйшлі весткі аб асыгнаваньні ўрадам 10,000,000 злотых на адбудову ўсходніх ваяводзтваў і іх гаспадарчыя п трэбы. Пераважная часьць гэтага крэдыту будзе падзелена паміж каапэратывамі, банкамі і касамі.

За граніцай.

ЯШЧЭ Ў СПРАВЕ ДАГАВОРУ ПАМІЖ С.С.Р.Р. і ЛАТВІЯЙ. Савецкі ўрад заявіў, што савецка-латвійскі дагавор павінен быць ізноў перагледжаны. Гэта мае значыць поўны правал усіх перагавораў, якія вяліся да гэтага часу і якія трактаваліся, як дыпляматычная пабеда савецкай дыплёматыі. Савецкі урад заўляе, што пасол Аралаў пера высіў свае інструкцыі і згодзіўся на рад уступак абсолютна немагчымых для бальшавікоў. Уся справа заключаецца ў тым, што польскі ўрад катэгарычна патрэбаваў і для сябе такіх жа уступак, якія былі зроблены Латвіі. На гэта савецкі ўрад згодзіцца ня можа, чаму і рашыў адмовіцца ад дагавору з Латвіяй. Дагавор будзе перагледжаны нанова.

ПЕРАГАВОРЫ ПАМІЖ С.С.Р.Р. і ЭСТОНІЯЙ АДЛОЖАНЫ. Перагаворы паміж савецка-эстонскай дэлегацыямі ў справе заключэньня дагавору аб ненападаньні ізноў адложаны і адновяцца толькі пасьля Вялікадню.

ВУГАЛЬНАЯ ЗАБАСТОЎКА У АМЭРЫЦЫ. Спынілася праца на 2000 рудніках бурага вугалья ў Арканзасе, Іллінойсе, Індыяне, Іова, Міссуры, Огіо, Аклагаме і Пэнсільваніі. Бастуе каля 200,000 вуглякопаў.

Забастоўка выклікана эканамічнымі трэбаваньнямі. Магчыма, што забастоўка працягнецца вельмі доўга. У краі маюцца вялікія запасы ўжо гатовага вугалья. Магчымы забурэньні сярод бастуючых.

Комінтэрн выдаў адозву да работнікаў усяго сьвету з трэбаваньнем падтрымаць гэтую забастоўку. Комінтэрн цьвердзіць, што гэтая забастоўка мае такое-ж вялікае значаньне, як апошняя забастоўка ў Англіі. Комінтэрн асыгнуе адзін мільён рублёў на падтрыманьне бастуючых.

БАІ Ў СЫРЫІ. Па афіцыяльнаму паведамленью апэрацыі францускага войска проці паўстанцаў у Сырыі разьвіваюцца памысна. Ня гледзючы на тое, што паўстанцы атрымалі падкрапленьні, якія прыйшлі з Трансіорданіі, — якая знаходзіцца пад пратэктаратам Англіі, яны пацярпелі вялікае паражэньне.

ВЭНГЕРСКА-ІТАЛЬЯНСКАЕ ЗБЛІЖЭНЬНЕ Вэнгерскія газэты жыва абгаварываюць падарожу вэнгэрскага прэм'ера Бэтлена да Рыму, сцьверджаючы, што мэтай гэтай падарожы зьяўляюцца дзьве справы, а іменна справа доступу Вэнгрыі да мора і заключэньне трактату прыязьні.

БЕЗПАСРЭДНЫЯ ІТАЛЬЯНСКА-ЮГАСЛАВЯНСКІЯ ПЕРАГАВОРЫ. 5 сакавіка распачаліся безпасрэдныя перагаворы паміж Муссаліні і югаславянскім паслом ў Рыме Рачычам. Галоўнай тэмай перагавораў зьяўляецца ліквідацыя канфлікту паміж гэтымі дзяржавамі.

ЦЯЖКОЕ ПАЛАЖЭНЬНЕ РУМЫНСКАГА КАРАЛЯ ФЭРДЫНАНДА. Палажэньне караля безнадзейнае. Наступнік трону Кароль, які дагэтуль знаходзіўся ў Парыжы — выежджае да Бухарэсту.


ПАДЗЕІ Ў КІТАІ. Шанхайска - нанкінскі раён увесь знаходзіцца ў руках кантонцаў, войска якіх далей вядзе наступленьне. У вайскавых колах чужаземцаў у Шанхаі чакаюць, што кантонцы спаткаюць сур'ёзнае спраціўленьне ў раёне Сучофу, гдзе разам за палкамі Шантунга сконцэнтраваны значныя сілы Чан-Со Ліна. Сучафу як жалезнад рожны вузел, мае вялікае стратэгічнае значэньне. Думаюць, што Чан-Со Ліну прыдзецца або бараніць гэты пункт ні на што ня гледзячы, або назаўсёды адмовіцца ад панаваньня ў Палуднёвым Кітаі. У Сучофу знаходзіцца блізу палова ўсяе антыбальшавіцкае арміі.

Тымчасам войска Чан-Со-Ліна ў провінцыі Хонам б'е бальшавікоў.

АНГЛІЯ ДАБІВАЕЦЦА АНТЫСАВЕЦКАГА БЛЕКУ. Савецкія газэты ўказываюць, што Англія хоча аб'еднаць проці С. С. Р. Р. дзесяць дзяржаваў, у тым ліку: Вэнгрыю, Італію, Румынію, Баўгарыю, Польшчу, Эстонію, Фінляндыю і Літву. Чэмбэрлен узяўся ўхіліць разнагалосьсі паміж Вэнгрыяй і Румыніяй. Далей савецкія газэты пішуць, што трэба лічыцца з небясьпекай вайны ў сувязі з завастрэньнем англійска-савецкіх адносінаў і пасьпехам кантонцаў у Кітаі.

Рэдактар лёнданскае газэты „Обзэрвэр“ апублікаваў у аднэй з вялікшых амэрыканскіх газэтаў артыкул, у якім настайвае на ўтварэньні адзінага англійска-амэрыканскага фронту проці С. С. Р. Р.

Савецкі дыплямат.



Савецкі пасол у Латвіі Арагаў, які падпісаў латвійска-савецкі дагавор бясьпекі.

ВЫПАДАК З ФОРДАМ. З Нью-ёрку паведамляюць, што з вядомым мільярдэрам і фабрыкантам аўтамабіляў Фордам здарылася катастрофа. А іменна - калі Форд ехаў па шосе да дому, на яг[illegible] наскочыў ззаду нейкі [illegible] спіхнуў пад насып. Аўтамаб[illegible] [illegible]куліўся і прыдусіў Форда. Пала[illegible] Форда вельмі цяжкае.

[illegible]торыя газэты прыпісываюць катаст[illegible] замаху. Справа ў тым, што Форд выступіў з нейкімі сэнсацыйнымі рэвэляцыямі па жыдоўскаму пытаньню.

Дык магчыма, што катастрофа — справа рук жыдоўскіх тэррарыстаў.

Разгром Савецкага пасольства у Пэкіне.

На падставе ўпаважненьня, зробленага дыпляматычным корпусам, сто жаўнераў арміі Чан Со Ліна ўварвалася да Савецкага пасольства ў Пэкіне.

Пасьля кароткай перастрэлкі пасольства было апанавана жаўнерамі.

У памешканьні пасольства знойдзены кулямёт, пятнадцаць стрэльбаў і запас амуніцыі. Увесь пэрсанал пасольства заарыштаваны. Некалькі расейцаў і каля 20 кітайцаў адведзена з пасольства да паліцыйнага ўраду. Паводле пагалосак прычынай арыштаў і разгрому пасольства—была агітацыя гэтага пасольства.

Няудалы замах у Літве.

У пачатку сакавіка палітычная паліцыя ў Коўні напала на сьлед арганізацыі, мэтай якой было скінуць пры помачы аружнай сілы сучасны ўрад, каб установіць уладу сацыял-дэмакратаў. Палітычнай паліцыі ўдалося выкрыць плян замаху і загаворшчыкаў, прычым большасьць з іх арыштавана. Некаторыя аддаюцца пад вайсковы суд.

Адным з галоўных правадыроў арганізацыі быў пасол Сойму др. Паяуіс, якога арыштавана ў Шаўлях. На сьледстве др. Паяцуіс прызнаўся да віны.

Загавар лічыцца зьліквідаваным.

Кароткія навіны.

Англійская экспэдыцыя, адпраўленая на поўнач Бірмы для зьніштажэньня рабства, да гэтага часу істнуючага сярод дзікіх плямёнаў на англійска-кітайскай граніцы, мела спатычку з мясцовым насяленьнем. Тры чалавека з экспэдыцыі, у тым ліку адзін афіцэр – забіты, трое ранена і адзін прапаў бяз в дама.

У бліжэйшым часе ў Палестыне будуць выпушчаны новыя грошы. Палестынскі фунт будзе раўняцца англійскаму, але манэтная сыстэма будуецца за мэтрычнай сыстэме. Манэты зроблены па антычнаму абразцу.

У ніжэйшай палаце японскаго парлямэнту адбылася бойка, падчас якой цяжка ранены адзін дэпутат. Прэзыдэнт і віцэ-прэзыдэнт, лічучы сябе адказнымі за бойку, падалі ў адстаўку.

Англійскі бюджэт за мінулы год зьведзены з дэфіцытам 36,6 мільёнаў фунтаў стэрлінгаў. Перад гэтым дэфіцыт раўняўся 14 мільёнам.

У 1926 годзе ў Францыі зарэгістравана 766.000 нараджэньняў (у 1925 г.—768.000). Памёрла ў 1926 г.— 713.000 (у 1925 г.—780 000).

Прадстаўнікі розных амэрыканскіх цэркваў сабраўшыся ў горадзе Атланта падалі фэдэральнаму ўраду мэмарандум з пратэстам проці тэррорыстычных актаў, робленых таварыствам Ку-Клукс-Клан.

Констанцыя Буйло, як імпрэсыяністка.

(Крытычны нарыс.)

Констанцыя Буйло, аўтарка зборніку поэзыяў; п. н. „*Курганняя кветка*“, займае бязсумліўна першае мейсца сярод песьнярак Беларусі (другое—Н. Арсеньнева; трэйцяе -А. Кейрысова—„Цётка“).

З паходжаньня дачка дваровага служачага ў Вішневе Ашмянскага павету,—К. Буйло ўрадзілася ў самым канцы мінулага стагодзьдзя і адукацыю атрымала яна хатнюю, але шмат папоўніла яе праз сыстэматычнае чытаньне цэнных і карысных твораў.

Даведаўшыся аб беларускім руху ад аднаго студэнта — адраджэнца, яна захапілася справай і незабавам зрабілася сталай і выдатнай супрацоўніцай „*Нашай Нівы*“. Займаючы па чарзе рад службовых становішч у рожных інстытуцыях і прадпрыемствах грамадзкага характару, яна ўрэсьце—ўжо падчас вайны—выходзіць замуж за нейкага В. Калечыца і больш - менш з гэтага часу ўсякія весткі аб ёй спыняюцца. Паводле апошняй — з прад некулькі год, яна, пачынаючы з часоў рэвалюцыі, мелася жыць у Маскоўшчыне на станцыі Шахаўской, Аляксандраўскай жалезнай дарогі.

З той пары нічога ўжо больш аб ёй не чуваць!

Быць можа—памёрла яна, а хутчэй—заелі яе, як шмат іншых замужак, сямейныя клопаты і абавязкі, адрываючы адначасна ад літэратурнай творчасьці і наагул ад інтэлектуальнага жыцьця.

Ў кожным выпадку аднэй з пярвейшых задач для менскіх культурнікаў зьяўляецца выясьненьне далейшых лёсаў. К. Буйло, адшуканьне яе, калі яна жыве яшчэ, ухіленьне тых фактараў, якія спынілі яе паэтыцкую творчасьць і прыахвочаньне яе да далейшае літэратурнае працы, калі-ж яна памёрла—сабраньне ўсіх не друкаваўшыхся, або параскіданых па газэтам і календарам яе твораў дый апрацоўкі падрабязнае яе біографіі.

А цяпер пяройдзем да самага яе зборніку. Старанліва выданы ў 1914 годзе ў Вільні, заслужанай для беларускага адраджэнскага руху друкарняй М. Кухты,—ён абымае каля 100 старонак друку, фармату васьмёркі.

Зьмешчаныя ў зборніку творы не падзелены на нейкія асобныя аддзелы, але прыгледзіўшыся бліжэй, можна ў ім прыкмеціць пэўную з грубшага праведзеную групіроўку матар'ялу; гэтак у самым пачатку пераважаюць імпрэсыі з дадаткам вершаў патрыятычных, далей бачым вялікую групу вершаў любоўных, у канцы-ж—ізноў імпрэсыі.

Акрамя таго знойдзем мы тут, ў перамежку з іншымі паэзіямі, і некулькі вершаў фантастычных, прырода апісальных, а гэтакжа пару меленечкіх поэмак з сялянскага жыцьця. Пасьля вершаў, якім прысьвячана 50 старонак зборніку, рэшту яго займаюць два вершаваныя драматычныя творы, выяўляючыя даволі значную літэратурную вартасьць: 1) „*Кветка Папараці*“,—фантастычны абразок у 1 акце з сымвалічным зьместам, пісаны пад моцным уплывам Купалавага Сну на кургане“ і 2) „*Сягоняшнія і даўнейшыя*“,—драма ў 3-х дзеях з жыцьця сучаснае шляхты, малюючая барацьбу дзьвёх пакаленьняў: старога рэакцыйнага ўзгадаванага ў духу прыгонных часоў і маладога „народніцкага“, настроенага паступова і рэвалюцыйна. На гэтай канве песьнярка сьнуе гісторыю нешчасьлівага каханьня паніча з дваровай дзяўчынай, з якой той хацеў жаніцца, але бацька не даў на гэта згоды і проці волі выкіраваў сына на ксяндза; ад непамернае тугі сын дастае сухотаў і памірае.

Наскольки ў „*Кветцы папараці*“ бачым мы ідеолёгію пэрыяду зусім сьвядомага адраджэньня, па стольки ў „*Сягоньняшніх і даўнейшых*“ гучаць яшчэ даволі моцна ноткі шляхоцкага рамантызму.

Вяртаючыся да вершаў трэба адзначыць, што сярод іх галоўнай і найбольш характэрнай групай зьяўляюцца „эротыкі“ — вершы любоўныя, аднак дзеля таго, што мы іх як патрабуючых больш падрабязнага досьледу, разгледзілі ўжо ў адумысловым артыкуле на іншым мейсцы, спыняцца тут над імі ня будзем, а спрабуем высьветліць іншую, гэтак-жа вельмі цэнную і важную галіну яе творчасьці—*імпрэсыі*. Ўжо на 4-ай старонцы зборніку спатыкаем вельмі прыгожую і вызначную глыбінёй — думкі і поэтыцкім размахам імпрэсыю: „*На крыльлі песьні*“; вось яе пачатак:

„Ляту, нясуся ўзвыж, плыву па мягкіх хвалях...
„Як добра, лёгка мяне!“
„Гдзе я? Чырвонасьць зор, блакіт паднебнай далі“
„І сонца ясны блеск і прозрыстасьць крышталяў“
„Дрыжыць вакруг мяне“.
Ляту, нясуся... Гэй, які абшар шырокі!
Як мгла—душа і грудзь.
Там гдзесьці, ў даліне—ледзь ледзь дагледзіць вока —
„Ляжыць яна—зямля... Так нізка, так далёка!
„А тоны ўвысь плывуць,
„Мяне штось з імі рве, штось цягне страшнай сілай,
„Якаясь моц нясе...
„Што? —не згадаць ніяк-к жыцьцю ці да магілы...
„І ведаць не хачу... Мне добра так, так міла
„У высі нямой красы“!...

Але - ж не здарма наша песьнярка ёсьць, поўнай спачуцьця і каханьня для цёмнага сярмяжніка, ідэалісткай- „народніцай“!

Нечакана, у гэту краіну хараства, у якую перанясьлі пясьнярку мо—„чутыя праз яе сьпеў, або музыка („А тоны ўвысь плывуць“), а мо толькі поэтыцкае натхненьне,—ўрываецца балючы ўспамін аб мужыцкім горы і вяртае яе да сумнае сапраўднасьці:

„Ціх ! во штосьці ўкруг там дзіўна задрыжала,
„А сэрцэ ў тон яму
„Забілась моцна так. і біцца перастала..
„Дух зьмёр, а штось у глыбі там глуханыць пачала,
„Штось мчыць у ніз думу.
—„То б лю ціхі стогн прарваўся ў сьветлай песьні
„І міма праляцеў,
„І сэрца дрогнула, і дух заныў балесьне,
„І згінуў сон... Ізноў у чароўны край прадвесьні
„Мчыць душу дзіўны сьпеў“!...

Ідэю гэтага арыгінальнага па форме і зьместу вершу можна тлумачыць яшчэ і гэткім чынам, што асабістае шчасьце людзкое ёсьць нятрывалае і неадлучанае ад гора, з якім йдзе ў пары, сплятаючыся з ім ў адзін неразрыўны вузел...

Выразна — „народніцкай“ тэндэнцыяй пранікнута за тое чарговая імпрэсыя п. н,

ФІНАНСЫ І ГАСПАДАРКА.

Аплата заграмічных пашпартоў.

„Dziennik ustaw“ апублікаваў распараджэньне міністра скарбу і ўнутраных справаў па пытаньню аб аплаце заграмічных пашпартоў. Распараджэньне пакідае і падалей ас ноўную плату за пашпарт у 500 зл. Дазвол на паўторны выезд 500 зл. Пашпарт на некалькі разоў—1,500 зл, льготны пашпарт у гандлёвых і прамысловых мэтах — 25 зл. спэцыяльны льготны —20 зл, льготны на некалькі разоў — 150 зл

Льготны пашпарт за 25 зл., дазвол на новы выезд за плату 25 зл., таксама на некалькі разовы за 150 зл. выдаюцца адміністратыўнымі ўладамі першай інстанцыі асобам, выезджаючым за граніцу ў гандлёвых і прамысловых мэтах, калі прадставяць кожны раз пасьведчаньне ваяводзкага выдзялу прамысловасьці і гандлю, ці інжынэра прамысловага на сталіцу Варшаву, выданыя са згоды дэлегата скарбовага ўраду.

Для атрыманьня льготнага пашпарту за 20 зл. неабходны наступныя варункі; 1) пасьведчаньне міністра асьветы, што выезд патрэбны для навукі ці навуковых работаў, 2) для лячэньня пры пасьведчаньні аб беднасьці, 3) у мэтах таварыства беднай хворай асобе, 4) для ўдзелу ў міжнародных зьездах і 5) пры ўрадавай ці самаўрадовай дэлегацыі

Асобны артыкул распараджэньня прадбачыць прызнаньне льготнага пашпарту на падставе рашэньня міністра ўнутраных справаў у паразуменьні з міністрам скарбу ў выпадках, указаных вышэй.

Да сялян Віленшчыны.

Związek Kółek i Organizacyj Rolniczych Віленшчыны зьвяртае ўвагу сялян на тое, што выпаўшы нядаўна сьнег на слаба замёрзлы грунт і стварэньне абмерзьленай шкарлупы прадстаўляе небясьпеку распаўсюджаньня сьнежнай плесяні, пагражаючай поўным зьнішчэньнем азімага збожжа. Адзіным сродкам барацьбы ў цяперашняй хвілі зьяўляецца бараненьне азімага поля з мэтай зламаньня алядзянеўшай сьнежнай шкарлупы. Гэты сродак ўсільна рэкамэндуецца ўсім сялянам, каб ухіліць частковае зьнішчэньне азімых пасеваў.

Сплаў леса па Нёману.

Ковенскія часопісі паведамляюць, што быццам адна з вялікіх лясных фірмаў пачала перад ковенскім Урадам энэргічныя стараньні аб дазволе на сплаў леса з Віленшчыны па Нёману да Клайпэды. Гэта фірма быццам мае атрымаць у хуткім часе дазвол на сплаў 100,000 кубічных мэтраў дзерава з лясных абшараў Віленшчыны.

S.

Біржа.

Даляры	8, 90 – 8, 94 зл.
Залаты рубель	4, 65 зл.
Сярэбраны рубель	2, 76 зл.
Чырвонец	33, 75 зл.

Збожжа


(*Варшава*)

Жыта (100 кілагр.-6 пудоў)	— 43, — зл.
Пшаніца „ „	57 58 зл.
Ячмень брав.	— 40 зл.
Ячмень крупяны	— 36 зл
Авёс „ „	39 — 40 зл.

(*Віленшчына*)

Жыта (100 кілагр.)	42,50 — 43,50 зл.
Пшаніца „ „	57 — — 58, — зл.
Ячмень бравaровы	41 — 45 — — зл.
Ячмень крупяны	36 – 40 — – зл.
Авёс „	38 — — 42, 0 зл.
Картопля	8,50 — 10 — зл.

Англійскі танк



ужываны на апошніх манэўрах. У гэтым танку знаходзіцца маленькая гармата і 2 кулямёты.

Жыцьце провінцыі.

Нашая вучыцелька.

(*в. Уша, Красасельскае гм.*

У нашай вёсцы ёсьць школа. Пры школе ёсьць і вучыцелька, але нашы сяляне завуць яе не вучыцелькай, а мучыцелькай. Навучае не навуцы—а лаянкам, абзываючы нашых дзетак: беларусы бандыты, бальшавікі, п'яніцы і байструкі, каб гэтая Уша спалілася, каб гэтыя мужыкі—кацапы правалiліся скрозь зямлю і г. д

Калі адна жанчына пайшла даведацца да вучыцелькі, за што ейная дачка трэці дзень без абеду—дык абліла яе вадой.

Сьпісаны пратаколы за зьнявагу вучыцелькай грамадзян Казакевіча і Згажэльскага, якіх яна назвала злодзеямі.

Гэтыя пратаколы былі адасланы камэндантам у Вялейку да Школьнага Інспэктарату. Хутка наехаў і інспэктар, які склікаў вышэйпамянёных асоб і зрабіў дапрос

Паміма таго інспэктар знайшоў школу ў страшэнным анты-санітарным палажэньні. У калідоры кучы гною. У самай школе набруджана курамі і індыкамі і вельмі сьмярдзючае паветра Апрача таго былі сцьверджаны іншыя рэчы, аб якіх сорамна пісаць.

Ад'ехаў інспэктар не разьвітаўшыся...

Пасьля ад'езду інспэктара 25 сакавіка аж да гэтага часу заняткаў німа, хаця дзеці і ходзяць да школы. Але яна іх толькі лае рознымі словамі, застаўляе выносіць голымі рукамі гной з калідору, прычым дзеці могуць пакалечыць рукі Апрача таго зусім выгнана чацьвёра дзяцей Усьціновічаў, дзеці Казакевіча і Згажэльскага. Самая працэдура выганяньня адбылася гэтак:

—„Вон, зладзеі, бандыты.—Вашыя бацькі пажаліліся на мяне інспэктару. Але я гэтага не баюся. Хай брэшуць, як сабакі! А няхай толькі мяне перавядуць адгэтуль, дык як злаўлю каторага на вуліцы—калекам зраблю“.

І вучыцелька павыпіхала іх са школы.

Цяпер дзяцей і вяроўкай не загнаў-бы да школы.

М. У.

З Ліды.

У нас у Лідзе на Сувальскай вул. пад № 112 месьціцца паравы млын „Аўтамэт“, які ўпіраецца машынным аддзелам да Пастаўскае вуліцы, на якую вылівае з машыны перагарэўшую смалу з вадой. Гэты бруд ліецца па рынштоку каля вакон праз вуліцу, трапляе да гародаў, хлявоў і паскудзіць раку Лідзею, вадой з якой людзі карыстаюцца. Гэты бруд дае вельмі паскудны пах амаль не на ўсю Пастаўскую вуліцу. Жыхарам гэтае вуліцы, якім вельмі надаеў смурод—прышлося сабрацца, паразумецца ды падаць заяву да магістрату.

Не дачакаўшыся адказу пайшлі асабіста, каб магістрат—як мясцовы самаўрад – зрабіў якое небудзь распараджэньне і забараніў выпушчаць гэтае паскудзтва на вуліцу. Бо як ідзеш па вуліцы, дык ажно кепска робіцца і самлець можна.

Аднак магістрат на ўсё гэтае не зьвярнуў увагі. Была пададзена просьба да старoства, каб яно ўмяшалася ў гэтую справу. Прайшло ўжо шмат часу, як заінтэрасаваныя людзі дабіваюцца, каб Аўтамат ня пускаў бруду на вуліцу,—а вынікаў німа.

Цікава, на што ў Лідзе істнуе камісія пры магістраце, абавязкам якой зьяўляецца глядзець за парадкам і чысьцінёй на вуліцах.

Той што панюхаў.

З беларускай прэсы.

„В. Krynica“ ў N 14 у перадавіцы падае прыкрую вестку, што беларускі каталіцкі кс. Гадлеўскі мае адбываць сваю кару за палітычны праступак у турме, як звычайны праступнік, і зазначае, што паводле конкордату (артыкул 22) духоўныя асобы павінны адбываць кару альбо ў кляштары, альбо ў іншым законным доме, у прызначаных дзеля гэтага памяшчэньні:

Мы з свайго боку дзівімся, што ў мамэнт маральнага заняпаду вёскі і антырэлігійнай прапаганды з боку рожных комуністычных і інтэрнацыянальных элемэнтаў духоўныя каталіцкія ўлады не разумеюць патрэбы шанаваць аўтарытэт і павагу каталіцкага, хаця-б нават беларускага, ксяндза.

„Сялянская Ніва“ ў N 31 гаворачы аб развале Незалежнай Партыі Хлопскай і аб выступленьні з яе паслоў: Бона, Шакуна і Шапеля—піша.

„Дык вось як, нават блізкія супрацоўнікі і калегі Ваявудзскага дазнаўшыся аб бруднай працы пасла Ваявудскага пакідаюць яго. Толькі „наш манарх“ А. Луцкевіч аж са скуры лезе вон і бароніць хаўрусьніка, мусіць надта мілы яму гэты шлюб і смашны пірог дэфэнзыўшчыка.

Бачым, якую вартасьць мае ўся брахня Луцкевіча ў сваей газэце на Беларусаў. Яму таксама, як Ваявудзкаму-дэфэнзыўшчыку ходзіць толькі аб тое, каб баламуціць масы беларускага сялянства, каб падбураць іх проці беларускіх ідэйных працоўнікаў, каб таксама пхаць у вастрогі ўсіх тых, што ня могуць падпарадкавацца дэфэнзыве.

Цяпер заслона зусім ужо паднята, усё беларускае грамадзянства, а тым больш тое дагэтуль было падпарадкавана гэтаму юдашу, павінна наканец працёрці вочы і ачысьціць сваю працу ад уплыву здрадніка“.

Ганьба Ваявудзкаму, ганьба ягонаму абаронцу А. Луцкевічу.

Працоўныя масы, што ўжо цяпер пакутуюць за свае ідэі і пасланыя на гэтую пакуту правакатарамі, яшчэ скажуць самі сваю падзяку здраднікам“.

А Васька слухае ды есьць..

Грамадаўскія паслы сядзяць у турме..

Грамадаўскія дзеячы з вёсак сядзяць у турме...

Грамадаўскія сэкратарыяты, камітэты і гурткі зачынены паліцыяй... А ён — інсьпіратар, фактычны кіраўнік і фінансіст — Сьмердзякоў на волі і карыстаецца ўсімі даброцьцямі жыцьця!?

„В. Krynica“ ад 1 сакавіка падае:

„Новая камэдыя. Урад польскі з Беларусамі часта робіць камэдыі Але астатнім часам дык завяршыў усё. У Горадні ўрад зарганізаваў нейкае быццам беларускае „Аб'яднаньне“, на чале якога паставіў п. Валэйшу. Гэтая „паважная арганізацыя“ нават выдае сваю газэту: „Беларуская Доля“. Такая ўжо Беларусаў доля„!

Падаем да ведама „В. Krynicy“, што гэтая камэдыя, якая была выключна чарговай клюбнай антрэпрызай Валэйшы — лопнула.

„*Каб я мела*“ (ст. 6), вызначная маладым ідэалізмам і сьпеўнасьцяй вершу:

„Каб я крыльле лёгкай птушкі
„Салавейкі мела,
„У гай вясёлы, гай зялёны
„Я-б не паляцела“..

. . . .

„...Я бы з песьняй паляцела
„У горад той далёкі:
„Там ёсьць дом пануры, сумны,
„Цёмны і высокі.
„На вакне закратаваным
„З песьняй-бы я села
„І вастрожнікам няшчасным
„Сваю песьню-б пела.
„Я пяяла-б аб свабодзе,
„Аб шчасьлівай долі,
„І забыліся-б пры песьні
„Яны аб няволі“..

. . . .

Яшчэ больш захапляе сваей непадкупнай шчырасьцяй, сьвежасьцяй пачуцьцёў і раскошным, наіўным прымітывізмам імпрэсыя „*У лесе*“ (ст. 7); вось яе зьмест:

„Як я лесам іду—на душы лёгка мне:
„Я адна ў лясной цішыне;

„Аддыхаю душой. Тут, між ёлак, бяроз
„Не чуваць ані енкаў, ні сьлёз;

„Тут між іх я люблю так хадзіць і хадзіць,
„Слухаць толькі што лес гаманіць.

„Часам хочацца птушкаю ў высь узьляцець,
„Між зялёных галінак запець,

„І шчасьліва пажыць, і ня відзець бяды,
„Што пануе ў людзей заўсяды.

„Тут люблю я глядзець, як дубочак з сасной
„Ціха шэпты вядуць між сабой;

„Як з расою—сьлязінай бярозка адна,
„Быццам мужа схаваўшы жана,

„Да зямлі валасы апусьціўшы стаіць,
„Чагось сумна і нудна шуміць“...

З іншых імпрэсыяў заслугоўваюць на ўвагу настраёвы „*Хаўтурны звон*“ (ст. 19), апісуючы хаўтуры сяляніна; гучная „*Лебядзіная песьня*“ (ст. 20; дэлікатныя „*Кветкі*“ (ст. 35) і субтэльны „*Матыль*“ (ст. 41); арыгінальна патрактаваная „*Туга*“ (ст 41), урэсьце поўная невыказанага хараства „*Раніца*“ (ст. 42) і тонкі па форме, магутны сваей экспрэсыяй безназоўны верш, пачынаючыся славамі: „Ваал!—Я ўсё ужо спаліла на аўтары“... (ст. 51).

Вось зьмест „*Раніцы*“:

„У вакно маё яснасьць глядзела
„Ўсходам ясным, вялікіх вачэй
„З русалчаных, сьвятлістых плячэй,
„Росы мглістыя хваляй ляцелі...

„Яе вусны штосьці ціха шапталі:
„Туды звала здаецца яна,
„Гдзе праменьнямі ветры гулялі
„Ды віднела палёў шырына...

„Хадзі, пойдзем далёка са мной;
„Завяду цябе ў ясны сьвет мой
„Хадзі, пойдзем, пакінь нуду злую,
„І ўсе чары яго пакажу я.

„І праменьні ў вакно мне кідала,
„І красою маніла сваей,
„І ў душы мне сьвятлеці пачала
„Пад пагляд яе сьветлых вачэй“.

А вось пачатак безназоўнага вершу на ст. 51.

„Ваал!—Я ўсё ужо спаліла на аўтары...
„Глядзі: высокаю узносіцца гарой
„Мой попял—і німа ўжо больш ў мяне ахвяры, –
„Дык не гудзі ты там пракляцьцем нада мной,
„Бо ўсё, што мела я, спаліла на аўтары...

Канчаючы гэтым агляд імпрэсыяў пясьняркі, пяройдзем цяпер да іншых, менш важных ў яе творчасьці, галін, ласьне да вершаў патрыятычных прыродаапісальных і з сялянскага быту.

Вершаў патрыятычных ёсьць агулам ня шмат; адны з іх маюць форму фантазыяў і ўспамінаюць слаўную мінуўшчыну, як напрыклад, безназоўны верш, пачынаючыся са слоў: „*Дзень сканаў*“.. (ст. 12), другія выяўляюць моцныя „народніцкія“ тэндэнцыі, як напрыклад прыгожы верш „*Да працы*“ (ст. 10), горача заклікаючы да прасьветнай працы сярод цёмных братоў:

„Да працы час, браты! Мы туманы разьвеем:
Бо, як ў пялёнках, ў іх наш сумны край ляжыць;
Каханьнем маладым мы дух яго сагрэем, —
Нізіны кіне ён і выжэй узьляціць“

Што-ж датыча вершаў прырода апісальных, дык іх у поўным сэнсе гэтага слова ў зборніку бадай што зусім няма, за тое ёсьць апісаньні прыроды, патрактаваныя ў форме фантастычных імпрэсыяў, як напрыклад: „*Ноччу*“ (ст. 17); „*Ноч*“ (ст. 40); „*Русалкі*“ (ст. 46).

Гэтак сама німа ў зборніку вершаў у дасл оўным значэньні сялянскіх і знаходзім тут толькі дзьве невялічкія поэмкі з сялянскага жыцьця з значнай падмешкай сэнтымэнталізму: „*Руты*“ (ст. 43—44) і „*Курган*“ (ст.48--49.

Канчаючы гэтым агляд зборніку „*Курганная кветка*“ адзначым яшчэ тое, што толькі поўная біографія пясьняркі, якой дасюль німа, дасьць магчымасьць выявіць поўнасьцю эротычны, асабісты, элемэнт ў поэзыях К. Буйло; тое мейсца, якое займаюць у яе творчасьці ўласныя перажываньні, але і цяпер ўжо відаць, што мейсца гэта агарамаднае!

У беларускай літэратуры К. Буйло займае выдатнае мейсца сярод пярвейшых песьсьняроў „нашаніўскае“ пары. Галоўную роль грае яна ў беларускім пісьменстве як *песьнярка каханьня*, але акрамя таго можна яе разглядаць, як: *імпрэсыяністку; патрыётку—„народніцу“ і аўтарку сцэнічных твораў*.

Пасьля эротыкаў, найвялікшую вартасьць ў яе творчасьці маюць імпрэсіі, тонкія і вышуканыя, нагадываючыя сваей інтэлігэнтнасьцяй творы М. Багдановіча.

Сьмерць яе была-б вялікай стратай для беларускай літэратуры, дык лепш цешмо сябе надзеяй, што ліра К. Буйло ня змоўкла яшчэ на векі і што йшчэ ўсьцешыць нас калісь яе соладкі сьпеў...

Канец

Я. Сьветазар.

Тутэйшая хроніка.

Безрабоцьце. Паводле Дзяржаўнага Ураду Пасярэдніцтва Працы ў Вільні прыблізная лічба безработных на абшары дзеяльнасьці гэтага Ураду раўняецца 5432 асобам, за чаго работнікаў гутных 1, мэталёўцаў 315; будаўляных — 617; іншых выкваліфікаваных — 1271; некваліфікаваных — 1559; земляробскіх 275; умысловых — 1384.

У самым горадзе Вільні знаходзіцца 5232 безработных, у тым ліку мужчын 3079 і кабет 1532.

Новая кніжка. Т-ва „Беларуская Хатка" выдала кніжачку пад назвай „Скарб" Я. Васілеўскага. Кніжка прыгожа выдана і багата ілюстравана. З прыемнасьцю адзначаем, што пасьля „Бяек" Б. Цадбярэскага — гэта першая беларуская ілюстраваная кніжка. „Скарб" выдрукаваны лацінскімі літарамі.

„Досьвіткі". Каля 15 гэтага месяца выйдзе № 1 новага, вялікага, багата ілюстраванага журнала — месячніка пад назвай „Досьвіткі". Выдае журнал „Беларуская Хатка".

Літэратурныя справы. Група маладых пісьменьнікаў — арганізуе ў Вільні літэратурны хаўрус. Мэтай хаўрусу ёсьць аб,еднань не ўсіх маладых літэратурных сілаў у Заходняй Беларусі.

Праца „Прасьветы" У сувязі з шпаркім ростам ліку гурткоў „Прасьветы" на провінцыі — выезджаюць з мэта інспэкцыі гурткоў, сябры Цэнтральнай Рады Т-ва „Прасьвета".

Жыхар Белавежы.



У Варшаўскім зьвярынцу знаходзіцца прыгожы алень з Бе вежскае пушчы.

Усячына.

Як расьце вартасьць зямлі.

Падчас судовага працэсу за спадак па адным вялікім ньюёрскім зямельным абшарніку аказалася, што грунт, цана якога ў 1917 годзе раўнялася 2 з паловай мільёнаў даляраў — сягоньня прадстаўляе вартасьць ад 4 да 5 мільёнаў даляраў.

Страшны білянс японскага землятрасеньня.

Пасьледствы астатняга японскага землятрасеньня прадстаўляюцца згодна з паведамленьнем японскага міністэрства ўнутраных справаў, так: 17 працэнтаў насяленьня на прасторы, абнятым катастрофай землятрасеньня, страціла жыцьцё або была раненых, 83 прац. дамоў зьнішчана, а матэрыяльныя шкоды абліча юцца на суму 50 мільёнаў даляраў.

Насяленьне Баўгарыі.

Паводле абвешчаных нядаўна вынікаў перапісу насяленьня, зробленага 1 студня б. г. насяленьне Баўгарыі, маючай 103,146 кілём. кв. прастору, у гэтым дню раўнялася 5,484,143 асобам.

Прытым аказываецца, што Баўгарыя зьяўляецца амаль адзіным краем у Эўропе, які лічыць больш мужчынаў, чымся кабет, бо прыпадае там 996 кабет на тысячу мужчынаў.

Насяленьне Баўгарыі павялічылася ад 1911 году на 637,170 асобаў, а знача гадавы прырост раўняецца 1,9 прац.

Хто мае згінуць.

Цікавы прысуд выданы ў Ля Пас у Балівіі (Палуднёвая Амэрыка), у справе чатырох абвінавачаных у забойстве б. прэзыдэнта Балівіі, гэнэрала Пандо. Згодна з прысудам лёс вырашыць, катораго з чатырох замахоўцаў казьняць. Іншыя тры атрымаюць кару дажыцьцёвага вастрогу.

Найвялікшы тунэль.

У Амэрыцы адчынены найвялікшы жалезнадарожны тунэль. Вядзе ён праз гару Джэмса і мае блізу 12 вёрст даўжыні. Збудаваў гэты тунэль інжынэр Мофэт коштам 12 мільёнаў даляраў. Будавалі яго прыватныя прадпрыемцы, думаючы што перададуць за добрыя грошы ураду.

Калі трэба жаніцца.

Ньюёрскі журнал пасьля расьследаваньня некалькіх тысячаў справаў, узятых з судовых матэр'ялаў у Філадэльфіі дайшоў да таго вываду, што найлепшым векам жаніцца для мужчыны будзе 29 гадоў, а для жанчыны 24 гады.

Ходзяць чуткі...

...што апошні з эсэраўскіх магіканаў Тамаш Грыб прыслаў да свайго прыяцеля Татунькі запытаньне ў катэгорычнай форме, каліж-ён нарэшце ўзарве буржуазную Польшчу, як гэта яны абяцаліся зрабіць у сваім эсэраўскім бюлетэні.

На што зьбянтэжаны Татунька адказаў: „Узрывы, узломы і г. д., дарагі таварыш, робяцца ў адпаведную хвілю (уначы), і ў адпаведным месцы А мне нажаль гэтага зрабіць у „Дні" ніяк нельга...

...што новая зьвязда на горадзенскім небасхіле Цюфяк-Кабылкін атрымаў з Менскага Г. П. У. новую порцыю даляраў (50 даляраў) за спрыт, што ўлез і зрабіўся віцэстаршынёй „Абжыраньня"...

...што „абшарнік" Цюцюкевіч атрымаўшы ад свайго патрона Вашэйлы адстаўку бяз мундзіра, пэнсіі і сыгараў—і зьвярнуўшыся да сваёй файкі — арганізуе асабіста-пэрсанальна-адзінока - абшарніцка - цюцюкоўскую партыю... Партыйныя ўзносы ўжо прымаюцца...

...што два разы біты па твары Кабылкін, віцэ-прэзэс „еднасьці", упарта шукае па Горадні новага трэцяга „хрэснага" бацьку...

...што вялікі Вашэйла даў з Вільні жудасную дэпэшу да сваей „Е...сьці" ў Горадню, што туды выежджае радашкоўскі Коўскі і вязе з сабой два пуды ляпісу...

ЛЯЛЬКА.

(З СЫРАКОМЛІ).

Ня плач, мая лялька, пакінь сваё гора!
Ціха сядзі, не матай галавой.
Паслухай аб чым гаварылі учора
Татка і мамка са мной.
Мне новую сукню шыюць з бракату,
А я павінна навучыцца
Малітвы францускія, бо мы бліскім сьвятам
Паедзем у цэркву маліцца.
Вось нашы сяляне будуць дзівіцца
На тыя малітвы, круціць галавой!
А мне дык па-польску ня гожа маліцца,
Быццам мужычцы якой.
Па ціху-ж па польску прасіць буду Бога,
Каб быці мне пекнай, расьці найхутчэй,
Каб татцы Ен даўбы так многа, так многа
І белых і жоўтых грашэй.
А татка мой дужа любіць манэты,
І служыць імшы ён, ахвяры дае.
—„Бог шчодра заплоціць"—кажа — „за гэта
І з коптарам зьверне ўсё мне!"
Вось ён і моліць аб грошах ўсё Бога,
Кашэль напаўняе ўсё свой,
І хутка ўжо грошаў ў нас будзе так многа,
Што мы не зрахуем з табой!
Ах, лялька! зусім, ну зусім ты дурная!
Ты думаеш Бог прыдзе сам?
Або анёлы зьлятуць да нас з раю
І грошай адвалюць тых нам?
Не! зьявіцца жыд у брудным жупане,
І будзе нам грошы насіць.
За грошы мы купім сялян, а сяляне,
Нам будуць гараць і касіць.
Бо ж мы, каб ты знала—паны, я вось панна,
Сяляне-ж сярмяжны, просты народ.
Сам Бог так наладзіў, каб яны няўстанна
Служылі на панскі ўвесь род.
Фэ! як яны брудны, цёмны і пьяны!
Сярмягі дзіравы, ходзяць ў лапцёх..
А хто вінаваты? Ня слухаюць пана—
Вось і карае іх Бог!
Тата мой любіць ахвоту і коні.
Мамка сабакі кахае.
Халопаў любіць—сам Бог наш бароне,
Іх кожны б'е толькі і лае!...
Вось ўчора: мой татка спаў ў кабінэце,
Яны-жа—Ці-ж можна іх распушчаць?—
Прыйшлі, нарабілі сьлядоў на паркеце:
—„З голаду дохнем!" — крычаць...
За гэта розгамі былі ўжо біты...
Сапраўды, як буду сама панаваць,
Дык пакуль ня будуць сяляне ўсе сыты
Спакойна ня лягу я спаць!
Дый сон той ці прыдзе, калі вось згрудзіцца
Галодны народ пры вакне?
Шчэ нейкі страшэнны жабрак можа сьніцца,
Дый схопе у торбу мяне?
А горай баюся каб Божанька з неба
Ня бачыў, што робім мы тут беднякам.
Папросім жа ў Бога—здароўя і хлеба—
І татцы і матцы і мужыкам!

Б. Друцкі.

Паштовая скрынка.

Т. Паўлюкевіч, М. Усьціновіч — з прысланага карыстаем.

Карэспандэнту з Ліды — аднаго жарту зьмясьціць ня можам. Прысылайце болей.

Мікірэй — ваш твор перадалі мы да рэдакцыі маючага выйсьці журналу „Досьвіткі".

Мілевіч Арсень — каталёг кніжак з цэнамі вышле Вам Беларуская Кнігарня.

Беганскі Р., Самохвал Янка—журнал бясплатна будзе разасланы толькі платным падпісчыкамі карэспандэнтам.

Сапоцька Янка, Сьветавастокаў К. — адказ будзе дадзены ў чарговым нумары „Беларуск. Слова",

Гулёда Міхась—просьбу спаўняем.

Берднік Міхась, Кавалеўскі Пётра, Юшчук, Антон, Брында М., Дзівак Сьцяпан, Залічынскі Сьцяпан, Мялюк Аляксандар, Паўлюкевіч Янка, Машэй Аляксандар, Гуз Юрка, Русак Уладзімер, Цукала Уладзімер, Папок Мікола, Улас Міхась—*газэту высылаем.*

Мажэй Грыгор, Спанко Мікола, Цэгалка Кастусь, Ромыш Язэп, Гаранін Юльян, Станько Янка, Лонко Міхал, Лонко Якуб, Узлоўскі Янка, Зялёнка Ігнат, Гаранін Павал, Цэгалка Язэп, Савіцкі Адам, Станько Піліп, Цэгалка Аляксандар, Цэгалка Мікола, Цэгалка Філарэт, Ромыш Базыль, Гаранін Раман, Шэмекіта Юльян, Булыга Г., Шышло Міхал, Красоўскій Адам, Кур'яновіч Мікола, Бурсэвіч Язэп, Семак Захар, Глебовіч Давіл, Таяновіч Антон, Вэрэмей Міхал, Капцюх Уладзімер, Шапшалевіч Аляксандар, Хадаронак Мікола, Янэль Антон, Борак Юры, Пілецкі Тодар, Сідаровіч, Аляксандар, Вайцешонак Станіслаў, Шульжыцкі Юстын, Куліна Рыгор, Асіповіч Аркадзь, Цярэшка Язэп, Якубовіч Васіль, Серада Пётра, Альхавік Уладзімер, Ракевіч Янка, Міхнюк Міхал, Вэйга Рыгор, Крайновіч М., Крэчатоускі Сьцяпан, Пілецкі Кастусь—*пробныя нумары „Беларускага Слова" будуць высылацца да 1 траўня.*

Атрымана: ад Слагады Язэпа, Круглоўската А.—па 5 зл, Кулешы Сяргея, Навэрскага В, Юшчыка—па 2 зл., Берэшыка, і М. В., па 1 зл.

Вас. Лебедзеў-Кумач.

На валаску.

З савецкага гумарыстычнага журналу.

Якім Дзелякін, заведуючы Рубцоўскім аддзелам каапэратыва „Наша Пабеда", быў няпрыемна зьдзіўлены, перастрашаны, ашарашаны. Да яго нечаканна, як сьнег на галаву, зваліўся рэвізор з праўленьня

К прыезду рэвізора Якім ніяк ня быў гатовым. Ды і наагул гэты рэвізор ні па якім разрахункам не павінен быў зьявіцца. Па першае, рэвізія была зусім не даўна—месяца паўтара таму назад. А, па другое, праўленскі канторшчык Кавальчук заўсёды ў час папераджаў Якіма аб рэвізіях і нават падробнасьці паведамляў: хто і што рэвізаваць будзе. А на гэты раз — ня было папярэджана.

Якім Дзелякін моцна нэрвуючыся цёр рукой лоб:

— Рэвізор—праўленскі.. Чаму Кавальчук не папярэдзіў? Чорт яго ведае! Можа ён пакрыўдзіўся, што мала даў яму прошлы раз? Дык-жа трэба было сказаць! Ня можна-ж людзей падводзіць!. І чаго гэты рэвізор, — калі ў мяне ад апошняй рэвізіі нават пахвальны одзыў маецца? Нічога не разумею! Можа, Кавальчук захварэў? Можа, яго звольнілі? Ніяк не павінна быць гэтага рэвізора! Ну, ніяк!

Аднак, рэвізор важна сядзеў у заднім пакойчыку каапэратыву, раскрыўшы партфэльчык і не сьпяшаючыся праціраў акуляры. Факт заставаўся фактам. І Якім ведаў, што з фактамі трэба лічыцца

Дзеля гэтага надзеўшы новы фартух і выцiснуўшы на сваім шырокім і рабым твары марную ўсьмешку, ён сьмела пайшоў на сустрэчу небясьпецы, стараючыся па магчымасьці прыняць від малайца:

— Надоўга да нас? Праездам ці па нейкай асаблівай неабходнасьці?

Рэвізор ледзь падняў вочы ад папераў:

— Не, я не праездам. Я камандзіраваны іменна да вас. Зрэвізую і вярнуся з паваротам.

Сэрца Якіма Дзелякіна ўпала. Аднак ён пастараўся ўсьмяхнуцца яшчэ больш ветліва і спакойна:

— Хы-ы... Вельмі прыемна! А, выбачайце, што непакою, што-ж гэта за прычына такая, „вось рэвізіі вашай? Падлічыць нешта, ці што?

Рэвізор буркнуў нешта ў родзе—угу! — выразна не жадаючы падтрымліваць пустапарожнюю размову. Але Якім не ўнімаўся:

— Скажыце, — гэта, знача, цяпер па ўсім аддзелам гэткая вось рэвізія будзе?

— Не. Не па ўсім. Я пасланы да вас дзеля таго, што тут была на вас адна маленечкая заявачка, дык вось і мяне прыслалі праверыць.

Якім затросься і перастаў усьмяхацца. Рукі раптам зрабіліся потнымі, і ў вушах зазьвінела.

— Прапаў! Заява?.. Гэта ня інакш, як Мікола Барсукоў. І чорт мяне дзёрнуў тады яго выжыць... Сьмяротнага ворага нажыў. Прапаў! Загінуў!..

Якім замаргаў вачыма, зноў сабраўся з духам і прысеўшы на табурэт проціў рэвізора, зноў прымусіў сябе ўсьмяхнуцца. Між тым, рэвізор разлажыў ўжо нейкія паперы, вынуў дарожную чарніліцу і прыгатаваўся пісаць.

— Ведама, злодзеяў розных шмат на сьвеце...—прамармытаў Якім... — адкашліваючы і аблізываючы перасохшыя губы.

— Гэта вы да чаго, уласьціва?

— А да таго, што вось розныя даносчыкі істнуюць. Ты з якім небудзь нягоднікам паўздорыў, — а ён хэ-хэ зараз на цябе данос. Ведама на чэснага чалавека — лёгка наклепаць. Папера—дык—яна ўсё церпіць. Пішы на ёй якую хочаш няпраўду. Вось нягоднікі і карыстаюцца.

Рэвізор проста бліснуў на Якіма шкелкамі акуляраў:

— А мы вось зараз і паглядзім, дзе праўда дзе няпраўда. І вывядзем на чыстую ваду ня-го-дні-каў. Бо нягоднікаў—лавіць трэба? Так? Ці ня так?

Якім Дзелякін прымерз да табурэта і ледзь чутно прамовіў:

— Зусім правільна...

— Вось тут у мяне ёсьць да вас такія—сякія пытаньні — прадаўжаў рэвізор. Такія-сякія даныя я хачу даведацца ад вас асабіста, а пасьля ўжо прыступім да фактычнае праверкі. Напрыклад, гэтак: ці праўда, што вы ўзялі з каапэратыва ў свае асабістае карыстаньне ўсю партыю цьвякоў шасьцімілімэтровых і пасьля прыватным спосабам прадавалі іх толькі сваякам і знаёмым?

Якім Дзелякін паглядзеў на рэвізора з забабонным страхам:

— Чараўнік ён, ці што? Учора толькі цьвякі перацягнуў, а ён ужо ведае. Добра хоць я ўчора фунта са два толькі перапусьціў—рэшта цэлая... Трэба будзе Цішку пасланць прынесьці...

І, хутка супакоіўшыся, ён прамовіў ужо голасна і скрыўджана:

— Няпраўда гэта!.. Паклёп! Чысты паклёп! Цьвякі ўсе цэлыя! Гэта проста такі паклёп .. я проста нават і сказаць...

Рэвізор спыніў яго рукой:

— Пачакайце. Я прачытаю вам усё адразу, а пасьля ўжо вы мне скажаце, што па вашаму паклёп, а што не. Вось што мне ведама аб вашых справах. Вы трымаеце спэцыяльныя падпіленыя гіркі, каб ашуківаць куляючых. Раз! Вы спэкулюеце каапэратыўнай мукой: даеце ў доўг і атрымліваеце з вялікімі працэнтамі. Два! Вы на тры тыдні ўстрымалі зьніжэньне цэнаў: прадавалі па старым цэнам, запісывалі па новым і рожніцу клалі сабе ў кішаню. Тры!

Якім Дзелякін чуў, як з кожным сказам рэвізора ён тоне ўсё глыбей і глыбей:

— Усё, усё ведае! Нічога ня скрыеш! І пра муку, і пра гіркі! Згінуў! Зусім згінуў!

А рэвізор прадаўжаў:

— Вы прадалі ўсю атрыманую вамі партыю пэркалю мясцоваму багацею і міраеду Грэбеншчыкову.

Якім Дзелякін раптоўна падскочыў на табурэце:

— Каму? Каму?

— Грэбеншчыкову, Кузьме Грэбеншчыкову. Не перабівайце.

— Ды ў нас німа такога Грэбеншчыкова! Гэта у Рабцаве, ў Рабцаве, у вёсцы ёсьць Грэбеншчыкоў, а ў нас німа! І не прадаваў я яму нічога! Гэта можа яму, рабцаўскі Муханаў прадаваў. І я і ведаць ня ведаю!

Рэвізор раптам замаўчаў. Зсунуў акуляры на лоб, зноў апусьціў, высмаркаўся, перабраў паперкі і глянуў на Якіма:

— Дык гэта-ж які аддзел !? Рабцаўскі?

— Рубцоўскі. У нас вёска Рубцоўка. А Рабцава — гэта мястэчка! — блізу пракрычэў Якім, у сэрцы якога ўспыхнула раптоўна надзея:

— А вам у Рабцава трэба? Да Муханава?

— А-але... Мне, аказываецца, трэба да Рабцава. Відаць я памыліўся.

— Ну але, памыліліся! Ну але! А я гляджу, вы пра Грэбеншчыкова! А ў нас такога ніколі ня было! І наагул, гляджу, паклёп адзін! Чэснага чалавека — жулікам выстаўляюць. У мяне нават одзыў пахвальны ёсьць, а вы раптам з падазрэньнем, прост да сьлёз мяне скрыўдзілі!

Ролі пераменіліся. Рэвізор вінавата заморгаў вачыма:

— Даруйце, памыліўся... Мне-б хаця прозьвішча вашае спытаць...

— Нічога... я не злуюся!... Памылка з кожным здараецца. Толькі крыўдна мне вельмі было, як вы мяне падазравалі. А цяпер нічога! Я вам зараз гарбаты загатую, а тым часам коні знойдзем да Рабцава. Тут усяго вёрст дзесяць.

Рэвізор вінавата хаваў паперы:

— Ды вы не непакойцеся...

— Ды што вы, чаго непакоіцца! Акрамя радасьці нічога!

Зьбеларушчыў Р. Мур.

Адказны Рэдактар Т. Вернікоўскі. Друк. Выдавец. Т-ва АЛЬФА, Вільня Біскупья 12. Выдавец Беларуская Нацыянальная Рада.